18+ Яўген Аснарэўскі

сакавіцкія зайцы



Яўген Аснарэўскі
Сакавіцкія зайцы

http://www.litres.ru/pages/biblio_book/?art=42310122
ISBN 9785449663078

Аннотация

Кніга вершаў. Складаецца кніга з трох частак, ці трох зайцоў. Сацыяльныя і рамантычныя элементы сплятаюцца ў вершах утвараючы адзінае цэлае – паэзію поўную музычных рытмаў і яркіх вобразаў.

Содержание

Заяц першы. Іранічна-палітычны 5
Заяц другі. Сацыяльна-рамантычны 13
Конец ознакомительного фрагмента. 14

Сакавіцкія зайцы
Яўген Аснарэўскі

© Яўген Аснарэўскі, 2019
ISBN 978-5-4496-6307-8
Создано в интеллектуальной издательской системе Ridero

Яўген Аснарэўскі
сакавіцкія зайцы
Кніга трох зайцаў. Прысвячаецца Сержу Танкяну і Дарану Малакяну.
© Яўген Аснарэўскі, 2019 .

Заяц першы. Іранічна-палітычны

Грыбы
Усе, вядома, так шукаюць перамены ды
не лічацца праблемай ператружаныя вены
ўсіх прымаючых па схемах галю-галюцынагены,
Гены Гены Гены Гены, Пеці Васі ён жа квасіць!
Ён жа квасіць што? Ён не п'е віно.
Гэта нічаго, гэта не Яго,
не геройства, не пазёрства, але гэта што?
На свеце многа разнавіднасцяў грыбоў.
Як і дамоў, ды мужыкоў, ды чужакоў.
На свеце многа разнавіднасцяў грыбоў.
Як і дамоў, ды мужыкоў, ды чужакоў… уладароў.
Усе, вядома, так шукаюць перамены, ды
не лічацца праблемай, ператружаныя вены
ўсіх прымаючых па схемах галю-галюцынагены
Гены Гены Гены Гены, Пеці, Васі, ён жа квасіць…
але што?
Чабурашка-ніндзя
Эні-Бені, Рыкі-такі.
Бі ў ладкі дзеля сабакі.
Ты на плошчы ўвесь час.
Ім лавіць цябе як раз.
Эні-Бені, Рыкі-такі.

Кушай добрыя прысмакі.
Дручок гумы ў зубы шмяк!
Ты ахвяра дахадзяг.
Эні-Бені, Рыкі-такі.
Скачуць злосныя макакі.
Скачуць кошты і каты.
Хто за краты? Можа ты?
Гультавіна
У цябе ёсць трохі грошыкаў?
У цябе ёсць трохі грошыкаў?
У цябе ёсць трохі грошыкаў?
Дай на налог!
Закалоў я свінню, бо няма чаго есьці.
Закалоў я свінню, бо няма чаго есьці…
нявесце.
Але лепш закалоў бы яе, ды адрэзаў ёй ногі.
Бо яна гультавіна, ды сучка не плаціць… налогі.
Сакавіцкі Заяц
Ты думаеш, гэта так крута
Зняць перашкоды вясны.
А лялькаводам ды душыцелям смуты
Патрэбны ціхія сны.
Бо заяц… шалёны… побач… з табой.
Мяркуешь ты гэта ня можа быць звыклым
Тут шанец ёсць ачуняць.
Ты ўсім гаворыш, што жадаеш паніклым

Вярнуць магчымасць рашаць.
А заяц… шалёны… побач… з табой.
Мяркуешь ты яны стаміліся самі,
І заблукалі ў тупік.
Падчахлілісь яны, і ведаешь, з вамі,
лёгка расправяцца ў міг.
Ты думаеш гэта так крута
Зняць перашкоды вясны.
Для іх жа ты папросту дробны паскуда,
Для іх вы толькі аслы!
Бо заяц… шалёны… побач… з табой.
Заяц шалёны кіруе…
Кіруе краінай тваёй.
Рам-пам
Рам-пам-пум-лам-ба-да-лук,
У краіне ёсць бамбук.
Ну, а можа не бамбук.
Па башцэ бамбукам – стук!
Ёсць карэнні і кара.
Есці можна да хера.
Без заробку ты, малец?
Кушай дуб хутчэй, дурэц.
Кушай елку, кушай мох.
Каб ад голаду ня здох.
Трэба многа працаваць!
Бістро, бістро, тваю маць.

Рыбка

Ёсць адна рыбка – дзяўчына агітка.
Так многа ўсюды яе, што аж брыдка.
І брыдка казаць, што дадзерлася рыбка.
Але гэта факт,
Ясі, калі ласка.
Тут позна крычаць: тармазі!
Пайшло па хардкору,
Падвысахла змазка,
Вазі ў Тайланд – не вазі.
І хоць аддзірацца любіла малеча,
Цяпер аддзяруць аграменістым нечым.
А зараз мараль, тут сама прастата:
Коль рыбка мала, не раві на кіта!

Дык Татар

Дык Татар быццам Дык Чэйні.
Просты хлопец з Амерыкі, шаноўны, амаль амбасадар.
Чамусьці, чамусьці, чамусьці, у краіне гэтай не ўсе яму рады.

Песня пра начальніка

Ён зайграе на гітары,
Для адной прыемнай пары.
Можа скласці ён санет, згатаваць крута амлет,
разагрэць на кухні чайнік.
Хто такі?
Так, твой начальнік.

Для цябе ён зробіць гэта
калі ў лютым будзе лета,
калі Міша вадалаз, голым пакарыць Каўказ,
калі будзе то і гэта.
Добра, хопіць, песня спета.
Ніхто

А хто там ідзе ў той грамадзе?
Хто запальвае агні?
Хто нясе сцягі і ў бубны б'е?
Ніхто…

Сакрэт чыноўніка

Моўчкі ты адчыніла комін.
Гарэў агонь і не ведаў сакрэт,
Што Браніслаў Аляксандравіч Словін.
Чыноўнік, манюка ды імпатэнт.

7-га лістапада!

Дзень 7-га лістапада!
Па чырвонаму нарада!
Дзень пачатку новай моды.
Камсамол, ГУЛАГ, заводы…
На якіх кляпаюць танкі,
Глушаць спірт, стучаць кіянкай.
У кожнай ямцы па ракеце,

Няма паперы ў туалеце.
Вось такія халі-галі.
Вось які Саюз прасралі.

Шлях у ЛТП

П«е ён гарэлку і п'е самагонку
П«е ён партвейн ды віно.
Ён мае мамку на ёйным карку
Ездзіць ужо даўно.
П«е ён гарэлку і п'е самагонку
П«е ён партвейн ды віно.
Ён п'е і піва, пасля кефіру
А часам нават пасля эфіру
Дзе нейкія людзі ўсё грозяць свету
Узарваць планету.
Парваць планету.
Ён вельмі любіць,
Праграму гэту.
Любіць ужо даўно.
Была і жонка, раней была жонка.
У гэтага мужыка.
Але, вядома, была нядоўга
Нядоўга яна была.
П«е ён гарэлку і п'е самагонку
П«е ён партвейн ды віно.
Ён мае мамку на ёйным карку
Ездзіць ужо даўно.
Ён паліць цыгі, шмат паліць цыгі.

Трасецца яго рука.
Сям'і ён быццам бы як вярыгі.
Яны стаміліся ад хапыгі
Яны чакаюць ужо адлігі
Даўно чакаюць ужо адлігі.
Чакаюць адлігі без б…
Каб здаць яго ў ЛТП.

Заяц другі. Сацыяльна-рамантычны
Дэлфі

Дэлфі, нават калі ты робіш сэлфі ты вельмі прыгожая.

Ці гэта лагічна?

Але мой знаёмы аднойчы казаў, што ты на ахвотніка, што ты на ахвотніка…

Вось жа які чалавек.

Ты любіш кіно, шакалад і там штосьці яшчэ…

А! Любіш коцікаў.

Дэлфі, можа ты крышачку…

А часам цябе мінаюць шэрыя будні і нейкія хлопцы.

Час уцякае.

Вядома, табе гэта да бубна.

Навокал стабільнасць, стабільнабятоннасць…

А можа попросту не можаш зрабіць нічога, мілашка.

Дэлфі, можа ты крышачку, самую крышачку… дура!

Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «Литрес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на Литрес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.